Кніжны гасцінец

# ІНСТРУКЦЫЯ ПА ЛОЎЛІ ЧОРНЫХ КОТАК У ЦЁМНЫМ ПАКОІ

## Аповесць пра тое, што скарбы трэба шукаць у кампаніі вясковага дзеда са стрэльбай

**Андрэй Федарэнка. Шчарбаты талер. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2021**



Адзін з самых папулярных твораў празаіка — прыгодніцкая аповесць для падлеткаў «Шчарбаты талер». Яна была экранізаваная, вытрымала некалькі перавыданняў... Гэтым разам перавыданне адметнае: у серыі «Бібліятэка прыгод і фантастыкі». Чытво не толькі для дзяцей, займальная канва спалучаецца з аналітычай сур'ёзных праблем грамадства і адметным псіхалагізмам. Вось галоўная гераіня — гарэзлівая школьніца Аксана. Яе выхоўвае бацька — у маці іншая сям'я. А бацька ў разуменні большасці — няўдачнік... Некаторыя настаўнікі носам круцяць: галота... Хоць насамрэч — інтэлігент, гісторык, навуковец. У Аксаны свой спосаб спраўляцца з праблемамі: яна хлусіць. Віртуозна на хаду прыдумляе гісторыі. Сама заблытваецца ў сваіх выдумках... А дапамагаюць выблытацца з заганнай звычкі, вядома, выпрабаванні, якія прыгодніцкі жанр героям гарантуе. Да Аксаны выпадкова трапляе старажытная манета, якая з'яўляецца ключом да напалеонаўскіх скарбаў, схаваных — вось супадзенне! — якраз каля вёскі Аксанінай бабулі. Зразумела, з'яўляюцца антаганісты — хціўвыя бандзюганы, якія могуць і кіднэпінгам заняцца. Ёсць у гераіні і верныя паплечнікі ў пошуках скарбаў, асабліва каларытная парачка — вясковы дзед Макар з унукам Вовам, у чым пры жаданні можна ўгледзець алюзію на дзеда Талаша з унукам. Дзед мірны, працавіты, прастадушны, але ў небяспечнай сітуацыі можа на злыдняў і стрэльбу настаўць, і шротам пульнуць. Зразумела, кампанія сталоўчых герояў шукае скарб не дзеля багацця... Набор духоўных здабыткаў па спісе: спазнаць гісторыю свайго народа, навучыцца бараніць сяброў, даведацца, якая гэта каштоўнасць — родная мова. Бо разгадаць, дзе схавана напалеонаўскае золата, без ведання беларускай мовы было б немагчыма.

**Мілард Павіч. Хазарскі слоўнік. Масква, «Азбука-классика», 2020**



Першы раман сербскага пісьменніка Мілард Павіча прынёс яму неверагодную славу.

«Пісьменнік не раіць чытачу брацца за гэтую кнігу без вялікай неабходнасці... Чытаць не трэба так, як тузае чалавека гарачка альбо жар ліхаманкі, хваробы, якая прыходзіць прыступамі, праз дзень, і трасе хворага толькі па жаночых днях тыдня...»

Пачатак, які можна прыводзіць у прыклад, як завалодаць увагай чытача. Тым больш сваю думку аўтар прыпадабняе пуме, якую трымаюць за накінутыя на яе ласо чытач і пісьменнік, цягнучы ў розныя бакі — абодва не могуць аслабіць нацяжэнне, бо тады пума іх з'есць.

Напружыліся ўжо? І правільна. Аўтар засумаваць не дасць. «Хазарскі слоўнік» прысвечаны гісторыі выдуманага народа — гэта зусім не тыя хазары, якіх мы сустракаем у рэальных летапісах. Слоўнік, складанне якога прыпісваецца міфічнаму персанажу, з некалькіх частак: Чырвоная кніга распавядзе пра гісторыю хазараў з хрысціянскага боку, Зялёная — ісламская, Жоўтая — іўдзейская. У кожнай з кніг ёсць артыкулы, якія паўтараюцца, і новыя. У артыкулах з аднолькавымі назвамі могуць падавацца розныя звесткі. Чытаць можна паралельна, супастаўляючы артыкулы, ці запар, ды яшчэ ўлічыць, што ёсць жаночы і мужчынскі варыянты кнігі... Але гэта не матэматычная задача, у яе няма адзіна правільнага рашэння. Увесь сэнс — у працэсе чытання, калі з разрозненых каляровых шкельцаў мы спрабуем скласці нейкія вобразы і сюжэты... А галоўным чынам, атрымліваем задавальненне ад непаўторнага павічаўскага стылю, ад сюррэалістычных вобразаў аўтарскай міфалогіі. Дзе ёсць два люстэркі, «абодва былі зроблены з адпаліраванай глыбы солі, але адно з іх было хуткім, а другое марудным». Дзе ёсць магістральныя персанаж — прынцэса Атэх, на павеках якой былі напісаныя магічныя літары. Атэх угледзела сябе ў марудным люстэрку з заплюшчанымі вачыма, упершыню прачытала літары на сваіх павеках і памерла. Яшчэ адзін магістральны персанаж, якога можна скласці са згадак і алюзій — малады чалавек, ён з-за любові да Атэх трапляе ў клетку, падвешаную над вадой... Піша ёй лісты на панцырах чарапах і ракаў, якіх вылоўлівае ў рацэ... Сюжэты і персанажы нечакана выныраюць з плыні тэксту. Вось у некалькіх эпізодах згадваецца мастак Нікан Севаст, ён і ўвасабленне генія, які траціць значэнне са з'яўленнем роўных сабе, і д'ябальская спакуса мастацтвам... А потым мы чытаем, як вылавілі дзвюх чарапах з лістамі двух закаханых на панцырах, і мужчына пісаў: «Сыходзячы, я адшукаў поглядам Нікана і з боязню пагладзеў яму проста ў рот, баючыся, што ён адкусіць мой погляд. А ён гэта сапраўды зрабіў, у яго нават троху шчоўкнулі зубы, як быццам ён адхапіў кавалак». Ага, дык гэта ж, мусіць, той самы юнак з клеткі!

Дарэчы, гэтае выданне — мужчынская версія рамана, але не пераймайцеся, яны адрозніваюцца адной фразай.

Карацей, у цёмным пакой аўтар запусціў столькі чорных котак, каб хапіла на ўсіх.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.08 | 20.11 | 14.03 |
| Віцебск — | 5.56 | 20.04 | 14.08 |
| Магілёў — | 5.59 | 20.02 | 14.03 |
| Гомель — | 5.59 | 19.55 | 13.56 |
| Гродна — | 6.24 | 20.26 | 14.02 |
| Брэст — | 6.28 | 20.23 | 13.55 |

## Месяц

*Маладзік 12 красавіка. Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

*Пр. Палікарпа, Ціта. К. Анастасіі, Базыля, Вацлава, Цэзара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**15 КРАСАВІКА**

**У краіне**

**1906** год — нарадзіўся Іван Васільевіч Гутараў, беларускі літаратуразнавец і фалькларыст, член-карэспандэнт АН БССР, доктар філалагічных навук, прафесар. Садзейнічаў станаўленню ў Беларусі гісторыі і тэорыі эстэтыкі як самастойнага навуковага напрамку.

**1916** год — нарадзілася Марыя Мікітаўна Барсток, беларускі крытык і літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук, паэтэса. Аўтар шэрагу кніг пра творчасць беларускіх пісьменнікаў і па гісторыі беларускай літаратуры.

**1921** год — нарадзіўся Віктар Якаўлевіч Гапановіч, беларускі вучоны-отарыналарынголаг, доктар медыцынскіх навук, прафесар. З яго ўдзелам распрацаваны і выраблены фантомы-трэнажоры па отарыналарынгалогіі для падрыхтоўкі спецыялістаў па аказанні хуткай і неадкладнай дапамогі.



**У свеце**

**1841** год — нарадзіўся Канстанцін Міхайлавіч Быкоўскі, рускі архітэктар. Узводзіў у Маскве буйныя, манументальныя і грамадскія збудаванні са старанна прадуманай планіроўкай: Цэнтральны банк на Нягліннай вуліцы, шраг будынкаў Маскоўскага ўніверсітэта.

**1886** год — нарадзіўся Мікалай Сцяпанавіч Гумілёў, рускі паэт. Аўтар паэтычных зборнікаў «Рамантычныя кветкі», «Вогненны стоўп».

**1921** год — нарадзіўся Георгій Цімафеевіч Берагавой, лётчык-касманаўт СССР, генерал-лейтэнант авіяцыі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, двойчы Герой Савецкага Саюза, заслужаны лётчык-выпрабавальнік СССР. Здзейсніў палёт на касмічным караблі «Саюз-3». У 1972—1987 гг. — начальнік Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў імя Гагарына. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

**Так гаварыў...**

**ФРЭНСІС БЭКАН:**
*«Магчымасць украсці стварае злодзея».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Парады бывалых.**

**Калі вам давядзецца выбіраць паміж фінансавай незалежнасцю і сексуальнай прывабнасцю, выбірайце фінансавую незалежнасць. З гадамі яна стане вашай сексуальнай прывабнасцю.**

Пажылыя сужэнцы:

— Ведаеш, а наш шлюб, па сутнасці, — памылка.

— Што ты мелеш?!

— Я ж тады свіснуў, каб спыніць таксі, а падышла ты.

**— Разумееце, справа не ў тым, што ваша сям'я багатая! Я сапраўды кахаю вашу дачку і хачу з ёй ажаніцца.**

**— З якой з трох?**

**— Ды з любой!**

— Запомні, я ў цябе вельмі добрая! Я магу дараваць, нават калі ты нічога не зрабіў.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1037.

Нумар падпісаны ў 19.30 14 красавіка 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12